**Кузьмініч М.Л.,** *дацэнт*

# МАЙСТЭРСТВА ВЫКЛАДЧЫКА ЯК ПРАДМЕТ НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Даследаванне праблемы фарміравання і ўдасканалення педагагічнага майстэрства, якое праяўляецца ў дзейнасці і характарызуецца высокім узроўнем яе самаарганізацыі, магчыма толькі на аснове вывучэння гэтай дзейнасці. У рабоце навучальных устаноў шырока ўкаранілася такая форма выяўлення, вывучэння і распаўсюджання ўзораў выкладчыцкай дзейнасці (перадавога педагагічнага вопыту), як правядзенне адкрытых урокаў. Адкрытыя ўрокі даюць магчымасць атрымаць уяўленне аб прафесійных ведах, уменнях і навыках асобнага выкладчыка, аб выкарыстанні ім у сваёй педагагічнай дзейнасці сучасных навуковых дасягненняў, аб яго здольнасці да педагагічнай творчасці і ўзроўні авалодання спецыяльна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагагічным майстэрствам. Аб'ектыўныя даныя аб дзейнасці выкладчыка дазволяць яму самому вызначыць шляхі далейшага самаўдасканалення.

Ацэнка ўзроўню дзейнасці выкладчыка на адкрытым уроку адбываецца, як правіла, на падставе пэўных крытэрыяў па двух асноўных напрамках. Маюцца на ўвазе ацэнка зместу педагагічнай дзейнасці на канкрэтным уроку і ацэнка арганізацыі педагагічнай дзейнасці. Несумненна, змест вызначае форму (арганізацыю), і перш за ўсё ацэньваць трэба менавіта змест дзейнасці, яго адпаведнасць сучасным патрабаванням. Змест дзейнасці выкладчыка задаецца вучэбнай праграмай, якая павінна прадугледжваць і крытэрыі яго ацэнкі. Аднак самы аптымальны змест педагагічнай дзейнасці можа аказацца нерэалізаваным пры нізкім узроўні арганізацыі працы. Арганізацыя працы выкладчыка з'яўляецца больш стабільнай характарыстыкай яго дзейнасці і можа выступаць своеасаблівым паказчыкам пры вызначэнні і ацэнцы эфектыўнасці і якасці педагагічнай дзейнасці.

Для ацэнкі працы выкладчыка на ўроку мы прапануем 11 крытэрыяў, а ступень праяўлення кожнага з іх вызначаецца па 10-бальнай шкале. Велічыня бала сведчыць аб узроўні педагагічнай дзейнасці на ўроку па кожным крытэрыі. Такіх узроўняў чатыры: недапушчальны (0—3 балы), крытычны (3,1—5 балаў), дапушчальны (5,1—8 балаў), аптымальны (8,1—10 балаў). Крытэрыі і ўзроўні педагагічнай дзейнасці выкладчыка могуць быць прадстаўлены ў табліцы ці на графіку.

Недапушчальны ўзровень педагагічнай дзейнасці (сярэдні бал ад нуля да трох) азначае, што яна не адпавядае патрабаванням. Крытычны ўзровень (сярэдні бал у межах 3,1—5) сведчыць аб тым, што педагагічная дзейнасць адпавядае патрабаванням толькі часткова. Пры сярэднім бале ад 5,1 да 8 выкладчык дэманструе дастатковы (дапушчальны) узровень дзейнасці. Вышэйшы (аптымальны) узровень дзейнасці выкладчыка адпавядае ацэнцы ад 8,1 да 10 балаў.